Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СНЕЖНЯ 2017 г. СУБОТА №238 (28602)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Беспілотныя электракары замест аўтобусаў

СТАР. 5



## Чым адметнае беларускае незалежнае кіно?

СТАР. 13



## Уражлівая экскурсія ў наскальны манастыр

СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

*«У адпаведнасці з Мытным кодэксам ЕАЭС, які ўступіць у сілу 1 студзеня 2018 года, тэрмін выпуску тавараў ва ўсіх мытных працэдурах скарочаны з аднаго працоўнага дня да чатырох гадзін, што дазволіць знізіць матэрыяльныя і часавыя выдаткі як бізнес-супольнасці, так і мытных органаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0367 | ▲ |
| Еўра | 2,3931 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0751 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МЭТЫ АМБІЦЫЙНЫЯ, АЛЕ РЭАЛЬНЫЯ

### Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Камволь»

**За апошнія гады на прадпрыемстве многае змянілася. Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка, наведваючы «Камволь», прызнаўся: яго візіт напрамую звязаны з завяршэннем «вялікай эпапеі» мадэрнізацыі камбіната.**

### Захавалі «школу» і працоўныя месцы

Мадэрнізацыя праходзіла даволі складана, ды і мадэрнізаваць, рамантаваць, выпраўляць было што:

— Прыехаў, каб павіншаваць вас з заканчэннем вялікай эпапеі мадэрнізацыі «Камволя». Пачалі мы яе даўно, шмат коп'яў зламалі тут... Усё было. Але, думаю, мы выходзім на тое, што хацелі тут атрымаць — вырабіць добрыя тканіны.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# СЯМЕЙНЫ ЛАКАМАТЫЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары сталіцы Яўгенія і Віталій РАШЧЭНІ і іх дачка Соф'я.

■ Ведай нашых!

# І ЛЫЖЫ НЕ ПАДВЯЛІ, І СТРАЛЬБА

### Дар'я Домрачава перамогай у спрынтарскай гонцы вярнулася на вяршыню сусветнага біятлона



**У пятніцу ў аўстрыйскім Хохфільцэне стартаваў другі этап Кубка свету. Спаборніцкую праграму адкрыла мужчынская гонка, нягледзячы на зробленыя замены ў складзе нашай каманды, беларускія біятланісты не паказалі добрых вынікаў і не трапілі нават у топ-60. А вось жаночая частка зборнай падарыла заўзятарам пераможныя эмоцыі.**

Да часу яе старту Хохфільцэн накрыў снег, а значыць, ідэальная стральба была залогам поспеху. Лідар зборнай Дар'я Домрачава справілася з гэтым кампанентам біятлона ідэальна, з «нулём» акрамя нашай Дашы прайшлі дыстанцыю менш за 10 спартсменак.

Гэтая перамога стала 29-й у кар'еры трохразовай алімпійскай чэмпіёнкі і 7-й менавіта на спрынтарскай дыстанцыі, вікторыя перамясціла Дар'ю на 14-е месца ў агульным заліку Кубка свету.

Сёння ў гонцы праследавання Домрачава стартуе першай з добрым часавым зачынам. Надзея Скардзіна выйдзе на дыстанцыю 26-й, згодна з месцам, якое яна заняла ў спрынце, а Ірына Крыўко — 35-й. Надзея Пісарава і Дар'я Юркевіч учора сталі 87-й і 83-й адпаведна, што не дазволіла ім прыняць удзел у сённяшняй гонцы.

З перамогай Дар'ю Домрачаву павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!